# Мясцовае Самакіраванне

Газета для выбаршчыкаў і дэпутатаў мясцовых саветаў

ЗВЯЗДА

Штотыднёвы дадатак газеты

22 студзеня 2025 г. № 2 (783)


26 студзеня 2025

ВЫБАРЫ ПРЭЗІДЭНТА РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

## Спецыяльны выпуск

# КАБ ВЫБАРЫ — ЯК СВЯТА

**У найважнейшай палітычнай кампаніі краіны, якой, безумоўна, з'яўляюцца выбары Прэзідэнта, ролю работы людзей непасрэдна на месцах цяжка пераацаніць. Менавіта ад іх — ад прадстаўнікоў мясцовай улады, ад членаў выбарчых камісій — залежыць, наколькі зручна і бяспечна будзе выбаршчыкам на кожным асобна ўзятым участку, ці ўдасца зрабіць так, каб выбары для людзей сталі святам — як гэта было заўсёды і як патрабуе кіраўнік дзяржавы.**

**Карэспандэнты «Звязды» высветлілі, як рыхтаваліся ўчасткі, як быў арганізаваны электаральны працэс непасрэдна ў рэгіёнах, хто і з якім настроем працуе ў выбарчых камісіях. І нарэшце, чаму так важна прыйсці і прагаласаваць.**




## Безбар'ернае асяроддзе, неабходная дакументацыя, дадатковае падсвятленне




**Пра гатоўнасць сталічных выбарчых участкаў расказаў дэпутат Палаты прадстаўнікоў Беларусі Міхаіл МІРОНЧЫК.**

«У Каменнагорскай акрузе, дзе я з'яўляюся дэпутатам, большасць арганізацый — гэта ўстановы адукацыі, дзе размяшчаюцца выбарчыя ўчасткі, месцамі — не адзін, а нават у некаторых два, тры. Хачу сказаць, што памяшканні і склады выбарчых камісій цалкам падрыхтаваныя для работы. Кабіны для галасавання афармленыя ў адпаведнасці з патрабаваннямі заканадаўства. Ёсць спецыяльная кабіна для людзей з абмежаванымі магчымасцямі, у наяўнасці лупы, шрыфты Брайля, дадатковае падсвятленне — створаны ўсе ўмовы для галасавання выбаршчыкаў.

Акрамя таго, па словах дэпутата, аформленыя стэнды, дзе размешчана адпаведная інфармацыя, прадуманы шляхі руху для грамадзян — паказальнікі, безбар'ернае асяроддзе. І галоўнае, члены выбарчых камісій выразна прытрымліваюцца патрабаванняў выбарчага заканадаўства — не прымаюць ніякага ўдзелу ў агітацыйнай рабоце кандыдатаў!

Міхаіл Мі178ронч  ык падкрэсліў, што ў кутках выбаршчыкаў размешчана інфармацыя пра кандыдатаў на роўных умовах, а таксама неабходная дакументацыя аб рабоце выбарчага ўчастка. «Мне прыемна за калег сістэмы адукацыі Фрунзенскага раёна горада Мінска — яны профі ў гэтай рабоце. Упэўнены, што яны адказна выканаюць ўскладзеную на іх функцыю».

**Даніїл ХМЯЛЬНІЦКІ.**